А.І.Салохіна,
*дацэнт*

# ПРАКТЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА
## (на прыкладзе спецыялізацыі "народныя рамёствы" ў БДУ культуры)

Сярод асноўных відаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці мастацкі тэкстыль, і асабліва габелену, займае вядучае месца. Як вядома, мастацтва габелену звязана, з аднаго боку, з народнымі традыцыямі, у прыватнасці з ткацтвам, з другога — з прафесійнымі яго відамі — жывапісам, сцэнапісам, пластыкай.

У навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў мастацкага профілю неабходна ўлічваць гэту ўзаемасувязь, асабліва ў практычнай дзейнасці студэнтаў. У кожнай галіне, у тым ліку ў сістэме культуры, неабходны спецыялісты высокага інтэлектуальнага ўзроўню, якія б мелі дзелавыя і арганізатарскія здольнасці і былі б гатовы вырашаць складаныя задачы на ніве творчай і выкладчыцкай дзейнасці.

У працэсе практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ прадугледжваюцца:

— паглыбленне і замацаванне агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў, якія неабходны пры рашэнні арганізацыйных і метадычных пытанняў творчага характару;

— развіццё здольнасцей і імкненне да самастойнага набыцця ведаў, уменняў, неабходных для будучай прафесійнай дзейнасці;

— фарміраванне інтэлектуальных уменняў з мэтай аперыравання ведамі, атрыманымі ў працэсе навучання.

Будучы самастойным відам творчасці, мастацкі тэкстыль сёння ўяўляе складаную з'яву, у якой злучыліся рамяство ткача з вобразным мысленнем мастака. У сувязі з гэтым цяжка пераацаніць ролю практычнай

падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Пры праходжанні пачатковага этапу вытворчай практыкі мэтазгодна прыцягненне студэнтаў да знаёмства з фондамі запаснікаў музеяў, дзе ёсць прадметы народнай творчасці — ручнікі, посцілкі, адзенне і інш. Адначасова студэнтам рэкамендуюцца выкананне замалёвак, сімволікі арнаментаў, падборка этнаграфічнага матэрыялу.

Задачамі наступных этапаў вытворчай практыкі на II і III курсах з'яўляюцца паглыбленне і замацаванне спецыяльных ведаў у выкананні габелену. У сваёй методыцы мы кіруемся выказваннем Сальвадора Далі: "Пачніце з таго, што вывучыцеся пісаць, як старыя майстры. Пасля можаце пісаць, як вам уздумаецца..." Студэнтам рэкамендуецца прыняць да ведама параду вялікага майстра і на практыцы паспрабаваць сваімі рукамі спасцігнуць тэхніку старых майстроў. З гэтай мэтай прапаноўваецца выкананне копій шпалеры. Асноўным патрабаваннем пры гэтым з'яўляецца наступнае: работа павінна быць зроблена такім чынам, каб глядзелася як самастойны твор. У гэтым выпадку прадугледжваецца выкарыстанне розных відаў матэрыялу (кардон, тканіна і інш). Працуючы ў тэхніцы капіравання, студэнт набывае вопыт работы ў гладкім ткацтве, вучыцца злучаць вельмі тонкія адценні нітак, выводзіць тонкія лініі і штрыхі. Неабходна ведаць, што па такой методыцы правядзення практыкі мы працуем ужо некалькі гадоў, у выніку чаго значна палепшылася якасць выканання габелену.

Ва універсітэце культуры ўведзена дадатковая педагагічная спецыялізацыя з кваліфікацыяй выкладчыка спецыяльных дысцыплін. У сувязі з гэтым студэнты праходзяць педагагічную практыку, дзе вучацца выконваць новую для іх сацыяльную ролю і пры гэтым становяцца суб'ектамі новых зносін, аналага якім не было яшчэ ў іх прафесійным вопыце.

Праходжанне педагагічнай практыкі мэтазгодна папярэджваць лекцыйным курсам, мэта якога — дапамагчы будучым выкладчыкам уключыцца ў рэальныя педагагічныя зносіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пэўную значнасць у тэарэтычнай падрыхтоўцы студэнтаў да педагагічнай практыкі можа забяспечыць раздзел спецкурса “Прафесійны імідж педагога”. Студэнты звяртаюць увагу на знешнасць педагога, яго паводзіны, ацэньваюць яго прафесійнае майстэрства, г. зн. уменне данесці веды ў галіне габелену і другіх кірунках мастацкага тэкстылю да навучэнцаў. Пры гэтым мэтазгодна раскрыць два планы, у якіх выяўляецца вобраз педагога: па-першае, з пункту гледжання патрабаванняў да яго з боку грамадства і, па-другое, з пазіцыі таго, як педагог сам заяўляе аб сабе.

У ходзе педагагічнай практыкі студэнты павінны перш за ўсё засвойваць педагагічныя заканамернасці і прынцыпы, фарміраваць прафесійна важныя асабістыя якасці, забяспечваць паспяховаць арганізацыі і правядзення вучэбна-выхаваўчай дзейнасці.

Пры гэтым арганічна спалучаецца працэс навучання з творчай работай, студэнты пад кіраўніцтвам спецыялістаў набываюць веды, навыкі і ўменні ажыццяўлення дзейнасці ў канкрэтных прафесійных умовах. Акрамя таго, сутыкнуўшыся на практыцы з творчымі працэсамі, яны папаўняюць недахоп ведаў у той ці іншай галіне.

На V курсе студэнты маюць магчымасць аператыўна сабраць матэрыял для дыпломнай работы, у першую чаргу этнаграфічны, выканаць фотаэскізы, даць тэарэтычнае абгрунтаванне тэмы дыпломнай работы, знайсці тэхніку выканання будучага дыпломнага праекта.

Студэнтам, якія навучаюцца па акадэмічнай праграме, у змесце практыкі мэтазгодна вызначыць тэарэтыка-метадалагічнае абгрунтаванне бакалаўрскай і магістэрскай работы з мэтай набыцця навыкаў навукова-даследчай, прафесійнай і педагагічнай дзейнасці. Тут магчыма прыцягненне іх да навукова-даследчай работы кафедры, а таксама да выканання індывідуальных творчых работ.

Мэтамі бесперапыннай практыкі (вучэбнай, вытворчай, педагагічнай) студэнтаў універсітэта культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад курса да курса з'яўляюцца засваенне дасканалай тэхнікі выканання габелену і сістэмнае авалоданне дыдактычнымі прынцыпамі ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчага працэсу. Менавіта спасціжэнне сучаснай тэхнікі стварэння творчых работ забяспечвае пэўную ступень свабоды і раскаванасці ў мастацкім выкананні, што ў канечным выніку вызначае магчымасць пошукаў асабістага прафесійнага почырку, які ў перспектыве дапаможа студэнтам стаць спецыялістамі.

**Г.Б.Багданава,**
*аспірантка*

## ДАХРЫСЦІЯНСКІЯ І ХРЫСЦІЯНСКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ МАСТАЦТВЕ

Беларускімі даследчыкамі традыцыйнага народнага мастацтва сабраны багаты эмпірычны матэрыял практычна па ўсіх відах творчасці. Багатыя калекцыі зберагаюць музеі, шмат што сфатаграфавана і ўвайшло ў альбомы, асобныя манаграфіі, энцыклапедычныя выданні. Беларускае мастацтвазнаўства стаіць на парозе новага этапу свайго развіцця. Цяпер важна сістэматызаваць сабраны матэрыял.

Аналізуюць, пераасэнсоўваюць традыцыі сёння не толькі навукоўцы, але і самі творцы. Спынімся на праблеме суадносін дахрысціянскіх і хрысціянскіх традыцый у беларускім народным мастацтве.

Варта памятаць, што рэлігія была і застаецца формай ідэалогіі, у аснове якой ляжаць калектыўныя ўяўленні пра свет і чалавека ў свеце. Калі прасачыць этапы самаідэнтыфікацыі чалавека: прырода (чалавек не адасабляе сябе ад прыроды), першыя язычніцкія вераванні (чалавек пакланяецца прыродзе і боствам, якія яе ўвасабляюць), хрысціянства (чалавек пакланяецца адзінаму Богу і яго сыну Хрысту-богачалавеку), — а потым прааналізаваць ступень увасаблення іх у розных відах мастацтва, лёгка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ